# ПАСТАНОВА
калегіі ўпраўлення культуры Гродзенскага абласнога
выканаўчага камітэта

26 снежня 2023 г. № 30

Аб пацвярджэнні найменняў
“народны” (“узорны”) аматарскім
калектывам мастацкай творчасці
Гродзенскай вобласці

Заслухаўшы і абмеркаваўшы інфармацыю дырэктара ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці” Хільмончык К.В. аб пацвярджэнні найменняў “народны” (“узорны”) аматарскім калектывам мастацкай творчасці Гродзенскай вобласці, калегія ўпраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама адзначыла высокі мастацкі ўзровень, добры творчы стан аматарскіх калектываў, адпаведнасць артыкулу 250 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры і лічыць, што прадстаўленыя калектывы заслугоўваюць пацвярджэння наймення “народны (узорны) аматарскі калектыў”.

Калегія ўпраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама ПАСТАНАВІЛА:

1. За дасягнутыя поспехі ў эстэтычным выхаванні, адпаведны мастацкі ўзровень і творчыя паказчыкі, папулярызацыю нацыянальных культурных традыцый, актыўную канцэртную дзейнасць пацвердзіць найменне:

1.1. “ўзорны аматарскі калектыў”:

тэатру-студыі “Лицедеи” дзяржаўнай установы адукацыі “Гімназія № 2 г. Ваўкавыска”;

ансамблю эстраднага танца “Ваўкавыскія непаседы” дзяржаўнай установы культуры “Ваўкавыскі гарадскі Дом культуры”;

фальклорнаму гурту “Чобаты” дзяржаўнай установы культуры “Ваўкавыскі гарадскі Дом культуры”;

хору “Ветразь дзяцінства” дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 4 г. Ваўкавыска”;

студыі выяўленчага мастацтва “Чароўны аловак” дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 4 г. Ваўкавыска”;

франкафоннаму тэатральнаму калектыву “Точка зрения” дзяржаўнай установы адукацыі “Гімназія № 1 г. Ваўкавыска”;

хору “Іларыта” дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 2 г. Слоніма”;

хору “Светлячок” дзяржаўнай установы адукацыі “Гродзенская спецыяльная школа-інтэрнат № 1”;

ансамблю танца “Ліхтарыкі” дзяржаўнай установы адукацыі “Гімназія № 7 імя В.Ц.Калакольнікава г.Гродна”.

1.2. “народны аматарскі калектыў”:

ансамблю народнай песні “Берастаўіцкія музыкі” дзяржаўнай установы культуры “Берастаўіцкі раённы цэнтр культуры і народнай творчасці”;

аркестру народных інструментаў дзяржаўнай установы адукацыі “Ваўкавыская дзіцячая школа мастацтваў”;

ансамблю песні і танца “Цвецень” дзяржаўнай установы культуры “Ваўкавыскі гарадскі Дом культуры”;

вакальна-інструментальнаму ансамблю “Свободный стиль” дзяржаўнай установы культуры “Ваўкавыскі гарадскі Дом культуры”;

тэатру-студыі гульні “Ваўкавыскія забавы” дзяржаўнай установы культуры “Ваўкавыскі раённы Цэнтр культуры і народнай творчасці”;

ансамблю беларускай песні “Медуніца” дзяржаўнай установы культуры “Ваўкавыскі раённы Цэнтр культуры і народнай творчасці”;

сямейнаму ансамблю “Сваякі” дзяржаўнай установы культуры “Ваўкавыскі раённы Цэнтр культуры і народнай творчасці”;

драматычнаму калектыву “Скрыжаванне” філіяла “Роскі Дом культуры” дзяржаўнай установы культуры “Ваўкавыскі раённы Цэнтр культуры і народнай творчасці”;

фальклорнаму гурту “Чараўніцы” філіяла “Мацвееўскі Дом культуры” дзяржаўнай установы культуры “Ваўкавыскі раённы Цэнтр культуры і народнай творчасці”;

ансамблю песні “Згода” філіяла “Вярэйкаўскі Дом культуры” дзяржаўнай установы культуры “Ваўкавыскі раённы Цэнтр культуры і народнай творчасці”;

ансамблю песні і танца “Каларыт” філіяла “Ваўкавыскія электрычныя сеткі” РУП “Гроднаэнерга”;

вакальнаму ансамблю “Пяшчота” настаўнікаў дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 4 г. Ваўкавыска”;

мужчынскай вакальнай групе “Брэвис” Ваўкавыскага каледжа ўстановы адукацыі “Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы”;

харавому калектыву “Іаланта” ўнітарнага прадпрыемства “Фільтр” грамадскага аб’яднання “Беларускае таварыства інвалідаў па зроку” г. Гродна;

тэатру мініяцюр “Перасмешнікі” ўнітарнага прадпрыемства “Фільтр” грамадскага аб’яднання “Беларускае таварыства інвалідаў па зроку” г. Гродна;

тэатру танца “Альма Дэа” ўстановы адукацыі “Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт”;

вакальнаму ансамблю “Alto” (Высокі) гуманітарнага каледжа ўстановы адукацыі “Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы”;

студэнцкаму тэатру “Вернісаж” установы адукацыі “Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы”;

маладзёжнаму тэатру эстрадных мініяцюр “Кантры” дзяржаўнай установы “Гродзенскі гарадскі цэнтр культуры”;

тэатру “Памфлет” дзяржаўнай установы культуры “Свіслацкі раённы цэнтр культуры і народнай творчасці”.

2. На падставе хадайніцтва аддзела культуры Ваўкавыскага райвыканкама пацвердзіць найменне “ўзорны аматарскі калектыў” ансамблю польскай песні і танца “Ютшэнка” дзяржаўнай установы культуры “Ваўкавыскі гарадскі Дом культуры” з адначасовай зменай поўнай назвы калектыву на “ўзорны ансамбль танца “Ювента” дзяржаўнай установы культуры “Ваўкавыскі гарадскі Дом культуры” ў сувязі з унясеннем змяненняў і дапаўненняў ў змест дзейнасці калектыву.

3. На падставе хадайніцтва сектара культуры Бераставіцкага райвыканкама, аддзела культуры Ваўкавыскага райвыканкама пацвердзіць найменне “народны аматарскі калектыў”:

ансамблю польскай песні “Стокроткі” (Маргарыткі) філіяла па культурна-дасугавай дзейнасці аг. Макараўцы дзяржаўнай установы культуры “Берастравіцкі раённы цэнтр культуры і народнай творчасці” з адначасовай зменай базы дзейнасці калектыву на дзяржаўную ўстанову культуры “Берастравіцкі раённы цэнтр культуры і народнай творчасці”;

ансамблю народнай музыкі і песні “Уладары” дзяржаўнай установы культуры “Ваўкавыскі гарадскі Дом культуры” з адначасовай зменай назвы калектыву на “народны ансамбль песні “Уладары” ў сувязі са змяненнем жанравага накірунку калектыву;

ансамблю народнай музыкі і песні “Асалода” настаўнікаў дзяржаўнай установы адукацыі “Роская дзіцячая школа мастацтваў” з адначасовай зменай назвы калектыву на “народны ансамбль музыкі і песні “Асалода” дзяржаўнай установы адукацыі “Роская дзіцячая школа мастацтваў” у сувязі са зменай складу калектыву

4. На падставе заключэння рэспубліканскай атэстацыйнай камісіі аб прысваенні і пацвярджэнні найменняў “народны” (“узорны”) пазбавіць:

4.1. наймення “народны аматарскі калектыў” літаратурна-публіцыстычны калектыў “Неспакойныя сэрцы” ўстановы адукацыі “Гродзенскі дзяржаўны прафесійна-тэхнічны каледж бытавога абслугоўвання насельніцтва” ў сувязі з недастаткова якаснай паказанай

праграмай і не адпавяданню пунктам 1 і 2 артыкула 250 Кодэкса аб культуры Рэспублікі Беларусь;

4.2. найменне "ўзорны аматарскі калектыў" маладзёжны тэатральны калектыў "Сонейка" філіяла па культурна-дасугавай дзейнасці аг. Малая Бераставіца дзяржаўнай установы культуры "Бераставіцкі раённы цэнтр культуры і народнай творчасці" ў сувязі з недастатковa якаснай паказанай праграмай і не адпавяданню пунктам 1 і 2 артыкула 250 Кодэкса аб культуры Рэспублікі Беларусь.

Старшыня калегіі,
начальнік упраўлення
культуры Гродзенскага аблвыканкама А.В.Клімовіч